МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

6 лістапада 2013 г. № 19 (317)

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Наталля КЛІМОВІЧ:

«Людзі ўпэўнены: дэпутат павінен ім дапамагаць»

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

У дэпутата парламента ёсць дзве асноўныя сферы дзейнасці: працаваць над новымі законамі і ў акрузе. Пасля вывучэння і абмеркавання праектаў законаў у парламенцкіх камісіях ды Авальнай зале дэпутаты едуць у сваю акругу, дзе сустракаюцца з калектывамі, вядуць прыём грамадзян і вырашаюць праблемы канкрэтных людзей. Але як можна вырашаць праблемы акругі, калі не валодаеш матэрыяльнымі сродкамі, не распараджаешся чалавечымі рэсурсамі? Пра гэта мы распыталі намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Наталлю КЛІМОВІЧ, дэпутата ад Чкалаўскай выбарчай акругі № 96 (г. Мінск).

— Якія паўнамоцтвы мае дэпутат у акрузе?

— Статус дэпутата Палаты прадстаўнікоў дастаткова высокі і дазваляе па любым пытанні сваіх выбаршчыкаў наўпрост звярнуцца да любога чыноўніка. Праблемы маёй акругі мне вядомыя вельмі добра, бо сама з'яўляюся яе жыхаром, была дэпутатам гарсавета ў 25-м і 26-м скліканнях. Акрамя таго, як кіраўнік лячэбнай установы, заўсёды мела магчымасць увайсці ў кабінет да кіраўніка любой службы ці раёна, каб вырашыць нейкае праблемнае пытанне.

Якія бываюць праблемы? Падчас апошняга прыёму да мяне прыйшлі жыльцы аднаго дома ў прыватным сектары, які падлягае зносу. Восем чалавек — чатыры сям'і. Па цяперашнім заканадаўстве нарматыў агульнай плошчы жылога памяшкання, якое будуецца, роўны 15 кв.м на аднаго члена сям'і. Ім прапануюць адну трохпакаёвую кватэру плошчай 136 кв.м на ўсіх. Безумоўна, яны не згодны... На папярэдняй сваёй працы я з падобнымі пытаннямі не сутыкалася, таму спачатку мне трэба атрымаць кваліфікаваную кансультацыю спецыялістаў.

Аднойчы прыйшла жанчына, якая расказала, што яе сын, які жыве ў іншым раёне, пасля скарачэння ўжо год без працы. Маўляў, дапамажыце працаўладкаваць. Тут таксама не скажаш, што гэта не ўваходзіць у маю кампетэнцыю, бо людзі ўпэўнены, што дэпутат павінен ім дапамагаць.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ПРАВІЛЫ ПАРКОЎКІ

Найлепшы спосаб барацьбы з хамствам — штраф

Барыс ПРАКОПЧЫК

Дарожныя знакі, усталяваныя ў інтарэсах людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, не толькі пастаянна, у масавым парадку ігнаруюцца кіроўцамі, але і... знікаюць. І гэтыя праблемы, па вялікім рахунку, хвалююць толькі саміх інвалідаў. У чым, на жаль, зноў пераканаўся наш карэспандэнт, правёўшы «маніторынг» шэрагу аўтапарковак у Гродне, дзе ўстаноўлены знакі «Прыпынак забаронены» з шыльдай «Акрамя інвалідаў».

Спачатку па нашай просьбе быў праведзены рэйд з супрацоўнікамі Дзяржаўтаінспекцыі. Наведалі паркоўкі каля двух гандлёвых аб'ектаў. Пра першую, каля крамы «Мока» па вуліцы Горкага, наша газета летась расказвала ўжо двойчы. Месца тут шматлюднае (побач з гандлёвым цэнтрам — Грандзіцкі рынак), і чалавеку з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі на гэтай паркоўцы практычна не спыніцца. Хоць і стаіць слуп з адпаведным знакам — што 6 метраў парковачнага асфальту прызначаны толькі для транспартных сродкаў інвалідаў і людзей, якія іх перавозяць. Такая ж сітуацыя і цяпер: зноў пад самым знакам стаяць два аўтамабілі «Фольксваген» і «БМВ» без знака «Інвалід» на заднім шкле **(на фота)**. Хвілін 15 чакаем кіроўцаў, але яны да сваіх «колаў» не падыходзяць. Альбо заняты сваімі справамі, альбо, можа, убачылі, што фатаграфуюць, і паглядаюць збоку, чым гэта скончыцца...

Накіроўваемся да гіпермаркета «Алмі» на праспекце Касманаўтаў. «Час пік», калі людзі атаварваюцца пасля працы, яшчэ не надышоў, вольных парковачных месцаў хоць адбаўляй. Але... Аднаму з кіроўцаў захацелася паставіць машыну менавіта каля самага ўваходу ў краму **(фота на стар. 2 «МС».)**, літаральна ў метры ад вышэйзгаданага знака. А вось і гаспадар. Садзіцца за руль, аднак інспектар ДАІ ад'ехаць не дазваляе. Складаецца пратакол. Мужчына не спрачаецца і, як здалося, без аніякіх перажыванняў, нават з усмешкай на твары плаціць штраф (на сённяшні дзень гэтае парушэнне караецца санкцыяй у памеры 2 базавых велічынь). Яшчэ пашанцавала, што не прыйшлося раскашэліцца за паслугі эвакуатара і штрафстаянкі. Хаця, магчыма, для яго кашалька і гэта не праблема. А ці зробіць высновы — невядома.

Пакуль складаецца пратакол, на пляцоўцы паркуецца яшчэ адзін аўтамабіль. Супрацоўнік ДАІ пытае, ці ёсць у кіроўцы такое права. Няма. Аднак маладая жанчына лічыць нармальным тут спыніцца, бо, маўляў, з ёю дзіця і ёй хочацца стаць бліжэй да крамы. Хаця, паўторымся, літаральна ў некалькіх дзясятках метраў мноства вольных месцаў. У гэтым выпадку абыходзіцца без штрафу — папярэджваюць, каб больш не парушала.

Пад'язджаем да іншага ўваходу ў гэты гіпермаркет, дзе таксама хапае месца, каб прыпарковаць аўто. Але, тым не менш, бачым два аўтамабілі на паркоўцы для інвалідаў. Адзін з кіроўцаў тут на законных падставах: ён паказвае пасведчанне інваліда і дзякуе супрацоўніку ДАІ за ўвагу да «парковачнага» пытання людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. А што тут робіць другі кіроўца? Дзякуючы тэхнічным магчымасцям ДАІ вызначыць яго асобу і нумар мабільнага тэлефона не аказалася праблемай. Уладальніку паведамілі: калі ён праз хвіліну не падыдзе да свайго легкавіка, транспартны сродак будзе эвакуяваны на штрафстаянку. Кіроўца паспеў вярнуцца нават хутчэй, пасля чаго страціў па пратаколе 260 тысяч рублёў. Чаму тут спыніўся? Ды знак не заўважыў... Такія адгаворкі ўжо норма.

> **Месцы для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі працягваюць займаць усе, каму толькі хочацца. Прыехаў інвалід — спыніцца няма дзе. І гэта ўжо не выпадак — сістэма.**

Паводле інфармацыі Гродзенскай дзяржаўтаінспекцыі, з 28 жніўня па 31 кастрычніка ў абласным цэнтры за парушэнні правілаў паркоўкі аштрафавана 79 чалавек. Пры гэтым каля 50 кіроўцаў — на паркоўках у месцах, прызначаных для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Добра, што хамства не застаецца беспакаранным. Аднак рэальная колькасць парушальнікаў значна большая. У чым на наступны дзень пасля рэйду з ДАІ мы пераканаліся разам са **старшынёй Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў Васілём ЛУКАШЭВІЧАМ**.

— Мы ўжо неаднаразова такія рэйды з ДАІ праводзілі. Выяўляліся і штрафаваліся парушальнікі. Аднак пасля акцыі ўсё застаецца па-ранейшаму. Разумею, што ў ДАІ шмат і іншых задач... Аднак едзе нарад, бачыць парушэнне на паркоўцы для інвалідаў — здымеце яго хоць бы на відэакамеру і разбярыцеся з парушальнікам. Тыдзень-два мэтанакіравана эвакуатарам папрацуйце па гэтым пытанні, каб увесь горад «гудзеў». Раз, другі, трэці... Каб было, як у суседняй Польшчы, дзе рэдка які кіроўца парушыць правілы парковак для інвалідаў. Дарэчы, акрамя знака, паркоўкі там абазначаюцца адпаведным лагатыпам на асфальце. Заедзеш туды — мала не здасца, — зазначае Васіль Лукашэвіч.

Знаёмімся з некаторымі праблемнымі для інвалідаў аб'ектамі. Цэнтральны рынак. Паркоўка для інвалідаў занятая звычайнымі аўто, толькі адна машына з адпаведным знакам на заднім шкле. Во як пашчасціла чалавеку! Бо практычна заўсёды, кажа Васіль Лукашэвіч, інвалідам там не спыніцца. Па той прычыне, што побач са знакам размешчаны нейкія прычэпы, будкі з таварам. Вось і займаюцца паркоўкі для інвалідаў іншымі кіроўцамі. Дарэчы, непадалёк бачым і супрацоўніка ДАІ...

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭМА ДНЯ

Чакаюцца змены

Ці паўплываюць яны на эфектыўнасць мясцовага самакіравання?

Леанід ЛАХМАНЕНКА

Напрыканцы кастрычніка ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намесніка старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання Святланы Герасімовіч са старшынямі гарадскіх (гарадоў абласнога падпарадкавання) і раённых Саветаў дэпутатаў.

Дэпутатам — дэпутацкі дзень

Патэнцыял сельскіх Саветаў дэпутатаў, на думку Святланы Герасімовіч, яшчэ раскрыты далёка не поўнасцю. Яны маюць патрэбу ў канкрэтнай падтрымцы як дзяржавы, так і органаў мясцовай выканаўчай улады. Гэтая думка лейтматывам праходзіла падчас размовы старшыні Пастаяннай камісіі з калегамі.

Святлана Герасімовіч звярнула ўвагу на тое, што старшыні сельскіх Саветаў, іх дэпутаты, як і дэпутаты раённых і абласных Саветаў, даволі часта, па сутнасці, працуюць на грамадскіх пачатках, нярэдка ахвяруюць вольным часам пасля работы і ў выхадныя на карысць сваіх выбаршчыкаў. А ў дэпутатаў ёсць сем'і, дзеці, асабістыя справы, хатнія клопаты. З улікам гэтых абставін, а таксама неабходнасці павышэння ролі Саветаў усіх узроўняў былі выказаны сумесныя прапановы Савета Рэспублікі, Палаты прадстаўнікоў і рэгіёнаў аб унясенні некаторых змен у заканадаўства. Напрыклад, у Законе «Аб статусе дэпутата мясцовага Савета дэпутатаў» прапануецца замацаваць за дэпутатам права мець адзін свабодны дзень для вырашэння дэпутацкіх спраў у сваёй акрузе, сустрэч з насельніцтвам з захаваннем заработнай платы па месцы працы ці службы. І гэта своечасовая прапанова, лічыць Святлана Міхайлаўна. Па яе словах, сярод дэпутатаў шмат людзей разумных, неабыякавых, з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, адукаваных, якія хочуць і могуць працаваць у Саветах. Такіх людзей трэба падтрымліваць.

У сакавіку наступнага года адбудуцца выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. З гэтай нагоды Святлана Міхайлаўна выказала надзею, што дэпутатамі будуць абраны сумленныя і энергічныя людзі.

Больш грошай — больш магчымасцяў

Святлана Герасімовіч таксама падрабязна спынілася на прапановах з боку Рады па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, а менавіта — па ўзмацненні ролі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Яна падкрэсліла, што заканадаўчая база дае вялікія магчымасці для іх эфектыўнай дзейнасці, але рэалізаваць у поўнай меры свае паўнамоцтвы не заўсёды атрымліваецца з-за недахопу часу і сродкаў. Апошнім часам высветлілася, што кіраўнікі сельсаветаў не заўсёды могуць выкарыстоўваць грошы, зароблены ад правядзення аўкцыёнаў па продажы зямельных участкаў ці іх арэнды, на патрэбы сваіх тэрыторый. А гэта істотная крыніца папаўнення мясцовага бюджэту. Таму неабходна ўнесці яснасць у гэтае пытанне і дазволіць сельскім Саветам больш актыўна выкарыстоўваць зароблены сродкі на добраўпарадкаванне тэрыторый, фінансаванне работ і паслуг, якія маюць дачыненне да гэтай дзейнасці. На думку Святланы Герасімовіч, гэта няправільна, калі старшыня сельскага Савета вымушаны хадзіць з працягнутай рукой па кабінетах кіраўнікоў гаспадарак і прадпрыемстваў і прасіць іх знайсці магчымасць прафінансаваць тую ці іншую карысную для мясцовых жыхароў справу.

Таксама прапануецца спонсарскую бязвыплатную дапамогу, якая можа быць прадастаўлена сельсаветам у выглядзе грашовых сродкаў, будаўнічых матэрыялаў, працоўнай сілы для выканання зацверджаных планаў па добраўпарадкаванні населеных пунктаў ці захаванні гісторыка-культурных помнікаў і г.д., залічваць у бюджэты гэтых мясцовых органаў і выкарыстоўваць па мэтавым прызначэнні. Для павышэння ўзроўню фінансавага забеспячэння правоў і абавязкаў мясцовых органаў улады ў Савет Міністраў унесены шэраг іншых прапаноў.

Быць ці не быць камунальна–ўнітарным прадпрыемствам?

Як вядома, вакол іх ужо не першы год ідуць гарачыя спрэчкі і дыскусіі. Сваё стаўленне выказала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі. Яна нагадала: мець ці не мець такія прадпрыемствы — гэта права старшынь сельскіх Саветаў. Створана адпаведная юрыдычная база. Таму, калі старшыня Савета лічыць мэтазгодным адкрыць у сябе камунальна-ўнітарнае прадпрыемства, то, як той казаў, сцяг яму ў рукі. Ніхто забараняць не будзе.

Святлана Герасімовіч нагадала, што ў асобных раёнах гэтыя прадпрыемствы працуюць, і нават паспяхова. Іх досвед сведчыць аб жыццяздольнасці такой формы дзелавой дзейнасці. Дзякуючы КУПам у сельскай мясцовасці выконваюцца самыя розныя работы для вяскоўцаў, у тым ліку і на іх прысядзібных участках. У якасці прыкладу прыводзіўся Капыльскі раён. Там пры Цімкавіцкім сельвыканкаме, які ўзначальвае Алена Острыкава, камунальна-ўнітарнае прадпрыемства зарэкамендавала сябе з лепшага боку. Нягледзячы на тое, што цэны на яго паслугі вельмі прымальныя для вяскоўцаў, а накладныя выдаткі вялікія, прадпрыемства летась атрымала прыбытак 4 мільёны рублёў. Нехта ўсміхнецца, але, як заўважыла Святлана Міхайлаўна, для сельсавета і гэта грошы. Галоўнае ж у тым, што аказваецца дапамога людзям, сярод якіх шмат пенсіянераў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

АДКРЫТЫ ФОРУМ

«ПРОСІМ, МОЛІМ, УГАВОРВАЕМ...»

Што лягчэй: знесці дом ці знайсці спадчыннікаў?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Праблема пакінутых, безгаспадарчых дамоў асабліва актуальная ў аддаленых сельсаветах, невялікіх вёсках. Гаспадары паміраюць, дзеці-ўнукі разлятаюцца па краіне, а то і па замежжы, а пра бацькоўскія дамы забываюць. А хаты нярэдка разбураюцца, падворкі і ўчасткі становяцца крыніцай распаўсюджвання пустазелля. Ужо з 2006 года, калі быў прыняты Указ Прэзідэнта РБ № 70, сельсаветы працавалі над упарадкаваннем жыллёвага фонду. Але ж паступала нямала скаргаў на складанасць працэдуры прызнання дамоў нічыйнымі, на іншыя хібы заканадаўчага акта. На змену згаданаму ўказу прыйшоў іншы нарматыўны дакумент: у лютым 2012 года быў прыняты Указ № 100 «Аб захадах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці». Карэспандэнт «МС» пацікавілася ў кіраўнікоў сельсаветаў, як працуецца па новым указе і якія праблемы ўзнікаюць пры вырашэнні гэтай складанай для вёскі праблемы.

Святлана КУРЭЦ, выканаўца абавязкаў старшыні Крывошынскага сельскага Савета дэпутатаў Ляхавіцкага раёна:

— Працаваць па Указе № 100 можна, на мой погляд: там усё распісана, усё раскладзена па палічках. Ды і па ранейшым, 70-м Указе можна было вырашаць названыя праблемы, але тады патрабавалася больш часу, працэдура была больш зацягнутая. Цяпер можна афармляць дакументы крыху хутчэй. І ўсё было б добра, каб для гэтай работы ў сельсавеце быў спецыяліст. У нас, напрыклад, 11 вёсак, у якіх жыве 2700 чалавек. Маленькія населеныя пункты па сутнасці становяцца выміраючымі. На сённяшні дзень на тэрыторыі сельсавета налічваецца 124 дамы, якія пустуюць. Працэнтаў 90 гэтай нерухомасці маюць законных спадчыннікаў. Праўда, многае і з гэтай колькасці прыходзіць у заняпад, бо за бясцэнак дзеці і ўнукі прадаваць хаты не хочуць, а рэальны кошт за іх ніхто ў нашай глыбінцы не дасць. Астатнія ж 10 працэнтаў трэба прызнаваць нічыйнымі і зносіць. Сёння я займаюся трыма дамамі, якія проста перашкаджаюць суседзям, бо там усё зарасло, і пустазелле з кустоўем лезуць на суседнія ўчасткі. Рыхтуюцца дакументы ў суд, пасля яго рашэння застаецца толькі тэхнічная частка работы: знайсці патрэбную тэхніку, рабочую сілу, разабраць пабудову і прывесці ў парадак участак.

У нашым сельсавеце працуюць старшыня, кіраўнік справамі і спецыяліст на 0,75 стаўкі. Выходзіць, што рэальна займацца ўсёй дакументацыяй па названай нерухомасці можа толькі старшыня сельсавета, якому ніхто не адмяняў іншыя справы. Калі б фізічнай магчымасці весці такую аб'ёмную работу было больш, справы па навядзенні парадку з пустуючымі і трухлявымі дамамі пайшлі б хутчэй.

Аляксандр СОЦ, старшыня Чучавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Лунінецкага раёна:

— У нас населеныя пункты вялікія, людзей жыве шмат, і дамоў, якія не маюць законных спадчыннікаў, проста няма. Дакументы ёсць ва ўсіх, але далёка не ўсе патрэбным чынам даглядаюць бацькоўскія і дзедаўскія хаты. Пішам лісты, напамінаем, просім. Летась, праўда, знеслі адзін дом пасля падачы заявы законнага спадчынніка. Такая заява паступіла ў сельвыканкам, і пасля выканання неабходных фармальнасцяў транспартам СВК разабралі пабудову на дровы, участак ачысцілі і прывялі ў парадак.

Найлепшы спосаб ліквідаваць старыя, трухлявыя, непатрэбныя дамы — атрымаць заяву тых, хто мае на іх правы. Зараз і працуем у гэтым кірунку, вядзём перагаворы са спадчыннікамі.

Валерый ЛІС, старшыня Рухчанскага сельскага Савета дэпутатаў Столінскага раёна:

— На мой погляд, пасля прыняцця новага Указа, які прыйшоў на змену ранейшаму, становішча істотна не змянілася. Усё роўна працэдура прызнання дома нічыйным вельмі складаная. Перапіска са спадкаемцамі можа цягнуцца гадамі. Добра, калі сын ці ўнук былога гаспадара жыве ў Беларусі. А калі ў Расіі ці ва Украіне? Знайсці яго — ужо праблема. А не знайсці і прыняць рашэнне на свой страх і рызыку таксама пагражае наступствамі. Быў выпадак у нашым раёне, калі спадчыннікі больш за 20 гадоў не аб'яўляліся, А калі дом мясцовая ўлада знесла, яны адразу прыехалі. І, вядома, з прэтэнзіямі.

Думаю, рэальна зрушыць сітуацыю з месца было б магчыма пры ўмове прызначэння канкрэтных тэрмінаў на распараджэнне спадчынай. Трох гадоў, на мой погляд, было б цалкам дастаткова, каб пасля смерці гаспадароў дзеці альбо іншыя спадчыннікі афармілі дакументы на дом і сталі спадкаемцамі з усімі правамі, а таксама абавязкамі па ўтрыманні дома. Калі ж гэта не зроблена, дом варта прызнаць нічыйным, каб распараджацца ім магла мясцовая ўлада. Такая норма стала б рэальным стымулам для дзеяння грамадзян, а не для чакання. Паглядзіце, як у горадзе праявілася актыўнасць па прыватызацыі садовых участкаў, а таксама кватэр, якія раней не прыватызаваліся. Гэтак жа трэба і з нерухомасцю на сяле: каб быў парадак, павінен паклапаціцца не толькі сельсавет, але і той, хто мае права на яе. У мясцовай улады проста няма на гэта дастатковых сродкаў.

Тамара ВАБІШЧЭВІЧ, старшыня Валішчанскага сельскага Савета дэпутатаў Пінскага раёна:

— Я сказала б, нават не столькі Указ нам паспрыяў, колькі тое, што з гадамі мы набылі вопыт па вырашэнні пытання. За гэтыя гады я прыйшла да высновы, што адзінае для нас выйсце — правільная работа са спадчыннікамі. Мы іх просім-молім, угаворваем, але дабіваемся, каб яны самі разбіраліся са сваёй нерухомасцю. У нас за апошнія гады знесена некалькі дамоў, але гэта рабілі самі законныя спадчыннікі за свой кошт. У сельвыканкама на гэта проста няма сродкаў. Сёння дзень работы бульдозера каштуе сем мільёнаў. А дзе іх узяць? Ды і не адзін бульдозер патрэбен, каб знесці дом. Таму ўпор трэба рабіць на саміх гаспадароў нерухомасці. І калі б заканадаўства з часам скарэктавалі ў бок павышэння адказнасці гаспадара альбо спадчынніка, то гэта пайшло б на карысць справе скарачэння колькасці пустых старых дамоў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

МАРКІРОЎКА З ПРАТЭРМІНОЎКАЙ

Прайшоў той час, калі ў сельскіх крамах асартымент тавараў быў зусім бедным. Сёння насельніцтву на вёсцы ёсць з чаго і дзе выбраць. У асобных аграгарадках да дзясятка крам на населены пункт — з сучасным абсталяваннем у прывабным інтэр'еры. Пры гэтым усё ж дамінантнае становішча ў гэтым сегменце рынку традыцыйна займае спажывецкая кааперацыя. І сельскія жыхары па прадукты харчавання паранейшаму накіроўваюцца ў мясцовае райпа. Вось толькі якасць гандлёвага абслугоўвання не паўсюль на высокім узроўні.

Спецыялісты Камітэта дзяржкантролю Гомельскай вобласці правялі праверку рознічнай гандлёвай сеткі Калінкавіцкага райпа і высветлілі, што пакупнікам па-ранейшаму ў першую чаргу трэба ўважліва глядзець, ці не пратэрмінаваны тавар. Пратэрмінаванымі аказаліся больш за 40 найменняў прадуктаў у сямі праверяных сельскіх крамах. Напрыклад, у вёсцы Халоднікі прапаноўваліся два найменні паўфабрыкатаў са свініны, тэрмін прыдатнасці якіх мінуў... два месяцы таму, і 3 найменні кандытарскіх вырабаў, якія «пераляжалі» 21 дзень. У краме вёскі Бярозаўка кандытарскія вырабы, агароднінныя кансервы, соус таматны і сыр мелі пратэрмінаванасць ад 5 дзён да 5 месяцаў. Ва ўсіх 8 праверяных сельскіх крамах знойдзены розныя парушэнні санітарных нормаў і правілаў: невыкананне рэжыму захоўвання асобных тавараў, адсутнасць неабходнага інвентару для нарэзкі прадуктаў і інш.

Па выніках праверкі да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафаў прыцягнута 20 вінаватых асоб. Пратэрмінаваныя тавары забаронены да далейшай рэалізацыі, а іх кошт пакрыты за кошт вінаватых асоб. Акрамя таго, за знаходжанне ў продажы такіх тавараў, парушэнні санітарных нормаў і правіл разглядаецца пытанне аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці кіраўніцтва Калінкавіцкага райпа.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.